Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкевіцкая сярэдняя школа”

# Гульні да Дня Маці

Грышчанка Наталія Вікенцьеўна,
выхавальнік дашкольнай адукацыі
1 кваліфікацыйнай катэгорыі

аг. Грыцкевічы, 2022

1.Рухавая гульня “Прыбяры кватэры”

Мэта: развіваць увагу, хуткасць

На падлозе рассыпаны мячы чатырох колераў (роўнае колькасць кожнага колеру).

Раз, два, тры-ты кватэру Прыбяры!

Заданне: дзяцей неабходна сабраць мячы (кожны пэўнага колеру) у кошыкі, хто хутчэй.

2. Рухавая гульня “Падарунак маме”

Мэта: развіваць увагу, спрытнасць

Дзеці дзеляцца на дзве каманды. У кожнай каманды пусты кошык.

Заданне: выбраць з кошыка тое, што можна падарыць маме.

3. Рухавая гульня “Зварыць суп і кампот”

Мэта: развіваць уменне дзейнічаць у камандзе, увагу, памяць.

Дзеці дзеляцца на дзве каманды: адна будзе “варыць” суп (называць гародніну, а другая — “кампот” (называць садавіну). Выйграе тая каманда, якая назвала больш слоў.

4. Слоўнікавая гульня “Імя маёй мамы”

Мэта: фарміраваць уменне самастойна называць імя мамы; выхоўваць любоў да роднага чалавека.

Дзеці перадаюць па крузе сонейка і ў каго ў руках сонейка называюць імя сваёй мамы.

5. Дыдактычная гульня “А мая мама самая-самая!”

Мэта: фарміраваць уменне дапасоўваць прыметнікі з назоўнікамі ў родзе, ліку і склоне.

Могуць прымаць удзел усе жадаючыя. Удзельнікі сядаюць у круг. Цяпер задача кожнага расказаць пра сваю маму.

Удзельнік, які не змог успомніць у сваю чаргу мамчыны таленты выбывае з гульні, а перамагае той, хто застаўся.

6. Дыдактычная гульня “Каму, што трэба для працы”

Мэта: фарміраваць уяўленне пра прафесіі мамаў, прылады іх працы.

Дзеці, абапіраючыся на малюнкі з выявай прадметаў, называюць жаночыя прафесіі: лекар, прадавец, цырульнік, выхавальнік, праграміст і г. д.

7. Дыдактычная гульня " Падбяры слоўца»

Мэта: фарміраваць уменне дапасоўваць прыметнікі з назоўнікамі ў родзе, ліку і склоне.

Мама-самая прыгожая; мама-самая разумная; мама-самая працавітая; мама-самая актыўная; мама-самая адказная; мама-самая вясёлая; мама - самая таленавітая; мама-самая мілая; мама - самая спартыўная; мама-самая прыгожая.